**ПРЫДАТАК** – разнавіднасць дапасаванага азначэння, выражанага назоўнікам у назоўным склоне (з залежнымі словамі і без іх).

З паяснёным словам прыдатак можа звязвацца:

**бяззлучнікавай сувяззю**: *Цвіце, узбіраючыся на палках угару, і фасоля-павітушка…* (Б. Сачанка); *З жыцця сваіх землякоў-мікалаеўцаў чэрпаў Колас матэрыял для сваіх апавяданняў…* (С. Александровіч); *Расла яшчэ за князем на ўзбярэжжы Дзвіны-ракі дзяўчына-красуня, разумніца і рукадзельніца…* (С. Грахоўскі);

**пры дапамозе паясняльных злучнікаў** (*як, ці, або, гэта значыць*): *Бруно Шмульке, ці, як клікалі яго за вочы, Брунька-Шмунька, быў ціхім, непрыкметным чалавекам, негаваркім* (М. Лынькоў); *Яны, беларусы-перасяленцы, ці самаходы, як іх называлі, абжывалі тайгу…* (Я. Сіпакоў);

**пры дапамозе слоў па прозвішчы, па мянушцы** і пад.: *Новую настаўніцу, прыгожую, здаровую і яшчэ сарамлівую дзяўчыну па прозвішчы Бурак, у калектыве адразу сталі называць цукровым бураком* (Я. Брыль); *Антон, па-вясковаму Тонік, павольна ішоў палявой сцежкай праз жыта, накінуўшы на плячо рэмень эцюдніка* (А. Варановіч).

Паводле структуры прыдаткі бываюць:

**адзіночныя (простыя)** – выражаны адным словам: *Пад шчытом на павуціне Нішчымны колас-сіраціна Ў зацішку лёгенька гайдаўся* (Я. Колас); *Пералівам флейты-крыніцы Альшанік пяе без устанку (П. Пестрак);*

**развітыя (складаныя)** – выражаны словазлучэннем: *Амаль на тысячу кіламетраў працягнулася ад вытокаў да ўпадзення ў Дняпро паўнаводная Прыпяць – галоўная рака Палесся* (Ю. Лабынцаў); *Падняліся яшчэ на адзін пагорак, і перад намі Кушляны – радзіма Францішка Багушэвіча* (С. Александровіч).

Прыдатак можа быць выражаны сказам (калі гэты сказ абазначае адно паняцце): *Я помню вечары, калі пісьменнік па раздзелах чытаў у вузкім коле родзічаў і сяброў аповесць "У Забалоцці днее"…* (У. Калеснік).

Прыдаткі могуць абазначаць:

1) якасць або ўласцівасць: *Крывулькай-сцежкай у кустоўі салдат прайшоў уздоўж ракі* (В. Быкаў); *Цёк сок-бярозавік…* (Б. Сачанка);
2) уласныя геаграфічныя назвы: *Аднойчы летам мы праязджалі міма Брылёвай роднай вёскі Загора* (У. Калеснік); *Сымон Ракуцька даехаў па чыгунцы да горада Слуцка…* (К. Чорны); *Я сышоў з цягніка на сваёй станцыі Цярушкі ў пачатку дня…* (Л. Гаўрылкін);
3) назвы твораў, кніг, газет, часопісаў, устаноў, прадпрыемстваў: *З'яўленне рамана Івана Мележа "Людзі на балоце" стала сапраўднай літаратурнай падзеяй* (М. Стральцоў); *У Добрушы яны* [*паэты Янка Бобрык і Пятрусь Броўка*] *разам з ленінградскімі пісьменнікамі "выцягвалі з прарыву" папяровую фабрыку "Герой працы"…* (С. Грахоўскі);
4) прафесію, род заняткаў: *Салдат Гарбачэня ўжо з гадзіну ішоў лесам* (І. Гурскі); *Геніяльны твор дойліда Іаана – сведчанне высокай культуры Старажытнай Беларусі* (У. Арлоў); *Палясоўшчык Іван Азаровіч вяртаўся дадому стомлены* (Д. Нічыпаровіч);
5) сваяцкія адносіны: *Іван Макаравіч цікава і доўга расказваў пра свайго брата Алеся* (М.Бусько); *Прадслава-Ефрасіння, дачка полацкага князя Святаслава-Георгія, здолела кардынальна змяніць сваё ціхае, бесклапотнае жыццё ў бацькоўскім хораме…* (В. Лянцэвіч); *Дзед Аніс вучыў нас плесці кошыкі…* (В. Хомчанка);
6) нацыянальнасць, сацыяльны статус: *Мы меліся начаваць у аднаго настаўніка гімназіі – беларуса* (М. Шчаглоў); *Пані Глафіра Мікалаеўна… называла свайго і за*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*вочы, і ў вочы па прозвішчы: Міхалап* (Я. Брыль); *Пан Вашамірскі сам за гаспадаркай мала глядзеў* (З. Бядуля);

7) узрост, пол і інш.: *Бабка Марыя Антонаўна, у якой ён кватараваў, пахваліла Віктара за гаспадарлівасць* (А. Варановіч); *Грабцы -- дзяўчаты, маладзіцы— штораз варушацца жывей, бо чуюць голас навальніцы* (Я. Колас).

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ